антиковедов с международным участием. ЯрГУ им. П.Г. Демидова, 4–6 октября 2018. Ярославль : Филигрань, 2018. С. 139–149.
6. Сказки и повести Древнего Египта. Пер. и комм. И.Г. Лившица. М. : Наука, 1979.
7. *Ando C.* Imperial ideology and provincial loyalty in the Roman Empire. Berkeley, Los Angeles, London : University of California Press, 2000.
8. *Bergman J.* Per omnia vectus elementa remeavi. Réflexions sur l'arrière-plan égyptien du voyage de salut d'un myste isiaque // La soteriologia dei culti orientali nell' Impero Romano: Atti del Colloquio internazionale su La soteriologia dei culti orientali nell' Impero Romano, Roma, 24–28 Settembre, 1979. Leiden: Brill, 1982. P. 671–708.
9. *Betz H. D.* The "Mithras Liturgy". Text, Translation, and Commetary. Tübingen : Mohr Siebeck, 2003.
10. *Bosch-Puche F.* The Egyptian Royal Titularies of the Roman Emperors: A Local Version of the Imitatio Alexandri? // Chronique d'Égypte. 2015. Vol. 90. P. 276–305.
11. *Bowden H.* Mystery Cults of the Ancient World. Princenton, Oxford: Princeton University Press, 2010.
12. *Chassinat É.* Le mammisi d'Edfou. Vol. 2. Caire: Institute francais d'archéologie orientale, 1939.
13. *Daumas F.* Les mammisis des temples égyptiens. Paris: Les Belles Lettres, 1958.
14. *De Morgan J., Bouriant U., Legrain G.* Catalogue des monuments et inscriptions de l'Egypte antique. Première série, Haute Egypte. Vol. II–III. Kom Ombos. Vienne : Adolphe Holzhausen. 1902.
15. *Derchain Ph.* La visite de Vespasien au Sérapéum d'Alexandrie // Chronique d'Égypte. 1953. Vol. 28. P. 261–279.
16. *Dieterich A.* Eine Mitrasliturgie. Leipzig, Berlin : Teubner, 1910.
17. *Dundas G. S.* Pharaoh, Basileus and Imperator: The Roman Imperial Cult in Egypt. PhD Thesis. Los Angeles, 1994.
18. *Frankfurter D.* Religion in Roman Egypt: Assimilation and Resistance. Princeton, New Jersey : Princeton University Press, 1998.
19. *Helck W.* Hathoren, sieben // Lexikon der Ägyptologie. Bd. II. Wiesbaden : Otto Harrassiwitz, 1977. S. 1033.
20. *Herklotz F.* Aegypto capta. Augustus and the Annexation of Egypt // The Oxford Handbook of Roman Egypt. Oxford : Oxford University Press, 2012. P. 11–21.
21. *Lepsius K. R.* Denkmäler aus Ägypten und Äthiopien.Vol. IX. Abth. IV. Berlin, 1849–1858.
22. *Mariette A.* Dendérah: Description général du grand temple de cette ville. Vol III. Paris : Librairie A. Franck, 1871.
23. *Pfeiffer S.* Der römische Kaiser und das Land am Nil: Kaiserverehrung und Kaiserkult in Alexandria und Ägypten von Augustus bis Caracalla (30 v. Chr.–217 n. Chr.). Stuttgart : Steiner Verlag, 2010.
24. *Riggs C.* The Beautiful Burial in Roman Egypt: Art, Identity and Funerary Religion. Oxford : Oxford University Press, 2005.
25. *Tacács S. A.* Isis and Sarapis in the Roman World. Religion in the Greco-Roman World. Leiden : Brill, 1995.
26. *Tallet G., Zivie-Coche C.* Imported Cults // The Oxford Handbook of Roman Egypt / Ed. by C. Riggs. Oxford : Oxford University Press, 2012. P. 436–456.
27. The Greek Magical Papyri in Translation including the Demotic Spells. Vol. 1. London, Chicago : University of Chicago Press,1986.
28. Women and Society in Greek and Roman Egypt: A Sourcebook / Ed. by J. Rowlandson. Cambridge : Cambridge University Press, 1998.

# РЭЛІГІЙНАЯ ПАЛІТЫКА СЕПТЫМІЯ СЕВЕРА Ў ПРАЦАХ ДЫЁНА КАСІЯ І ГЕРАДЫЯНА

**С. М. Смірноў**

Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, г. Мінск, Беларусь, viales89@gmail.com

Дадзены артыкул прысвечаны разгляду асноўных асаблівасцей рэлігійнай палітыкі Септымія Севера ў працах рымскіх гісторыкаў Дыяна Касія і Герадыяна. Рэлігійная палітыка рымскага імператара заключалася ў прагматычным балансе паміж сінкрэтычнымі тэндэнцыямі і рымскімі традыцыямі ў духоўным жыцці Рымскай імперыі.

*Ключавыя словы*: Рымская імперыя; рэлігійны сінкрэтызм; Септымій Север; рымская рэлігія; рымскія гісторыкі.

## РЕЛИГИОЗНАЯ ПОЛИТИКА СЕПТИМИЯ СЕВЕРА В ТРУДАХ ДИОНА КАССИЯ И ГЕРОДИАНА

**С. Н. Смирнов**

Белорусский государственный университет, г. Минск, Беларусь, viales89@gmail.com

Данная статья посвящена рассмотрению основных черт религиозной политики Септимия Севера в трудах римских историков Диона Кассия и Геродиана. Религиозная политика римского императора заключалась в прагматическом балансе между синкретическими тенденциями и римскими традициями в духовной жизни Римской империи.

*Ключевые слова*: Римская империя; религиозный синкретизм; Септимий Север; римская религия; римские историки.

## RELIGIOUS POLICY OF SEPTIMIUS SEVERUS IN THE WORKS OF DION CASSIUS AND HERODIAN

**S. Smirnou**

Belarusian State University, Minsk, Belarus, viales89@gmail.com

This article is devoted to the analysis of the main features of the religious policy of Septimius Severus in the works of the Roman historians Dion Cassius and Herodian. The religious policy of the Roman emperor was a pragmatic balance between syncretism and Roman traditions in the spiritual culture of the Roman Empire.

*Keywords*: Roman Empire; religious syncretism; Septimius Sever; Roman religion; Roman historians.

У сусветнай гістарычнай навуцы даўно зацвердзіўся падыход, які разглядае гісторыю рэлігійнага жыцця Рымскай імперыі II–III ст. н. э., як перыяд распаўсюджвання праяў рэлігійнага сінкрэтызму і арыенталізацыі рымскай рэлігіі. Дадзены падыход атрымаў абгрунтаванне ў працы бельгійскага гісторыка рымскай рэлігіі Ф. Кюмона, які ацэньваў перыяд кіравання дынастыі Севераў, як час згасання традыцыйнай рымскай рэлігіі, абнаўлення духоўнага жыцця імперыі пад уплывам культаў і рэлігійна-спекулятыўнай філасофіі [4, с. 251–252; 13, p. 203]. Класічны падыход дагэтуль не губляе сваёй навуковай значнасці, але ён не адлюстроўвае аб’ектыўна складаную карціну рэлігійнай сітуацыі ў Рымскай імперыі, якая прадстаўляла сабой супярэчлівае спалучэнне і ўзаемную сувязь рэлігійнага сінкрэтызму і традыцыяналізму. Працы Дыёна Касія і Герадыяна дазваляюць даследчыкам выявіць пэўныя асаблівасці рэлігійнай палітыкі Септымія Севера, а таксама даць характарыстыку рэакцыі палітычнай і інтэлектуальнай эліты Старажытнага Рыму на дзеянні рымскага імператара [3; 2]. Акрамя гэтага, можна меркаваць аб сутнасці ўзаемадзеяння сінкрэтызму і традыцыі ў рэлігійнай прапагандзе заснавальніка дынастыі Севераў.

Рымскі гісторык Дыён Касій расказвае, што Септымій Север узвёў храм у гонар Пертынакса, які быў пазбаўлены ўлады падчас змовы рымскіх прэтарыянцаў (Cass. Dio LXXV 4. 1) [3, с. 231]. Новы імператар арганізаваў і ўзначаліў урачыстую цырымонію пахавання і абагаўлення памерлага імператара (Cass. Dio LXXV 4–5.) [3, с. 231–234]. Абагаўлёны Пертынакс атрымаў калегію жрацоў, у якой служыў сын памерлага імператара (SHA Pert., XV 1–5., Sev., VII 8–9) [1, с. 79–80, 89]. Герадыян згадвае ў сваёй працы, што пасля свайго ўваходу ў Рым, Септымій Север здзейсніў ахвярапрынашэнні вярхоўнаму богу рымскага пантэону Юпітэру Капіталійскаму, а таксама прыняў імя Пертынакса ад рымскага сената (Herodian II 14. 2–4) [2, с. 130–131]. Сведчанні рымскіх гісторыкаў паказваюць значнасць рымскіх традыцый для палітыкі Септымія Севера і пазітыўную рэакцыю рымскай эліты на дзеянні імператара. Але наступныя падзеі прадэманстравалі неадназначны характар стасункаў паміж Северам і рымскім сенатам. Дыён Касій апісвае значнае здзіўленне рымскіх сенатараў, калі Септымій Север абвясціў сябе сынам Марка Аўрэлія і братам Камада, які затым атрымаў статус абагаўленага імператара (Cass. Dio LXXVI 7. 4) [3, с. 251]. А. М. Штаерман выказала слушную думку, што абагаўленне Пертынакса і Камада адлюстроўвае палітычныя манеўры Септымія Севера, які спачатку шукаў падтрымкі рымскага сената ў барацьбе супраць Песцынія Нігера і Клодзія Альбіна, а потым пасля перамогі над апошнім працягнуў палітыку Камада ў дачыненні сената [5, с. 333]. Абагаўленне Пертынакса, а затым Камада былі мэтанакіраванымі крокамі Севера па ўмацаванні прэстыжу новай дынастыі і свяшчэннага статусу імператарскай улады. Заўважна, што рэлігійная палітыка імператара спрыяла фармаванню пазітыўнага прапагандысцкага вобразу новай кіроўнай дынастыі, якая пасля грамадзянскай вайны аднаўляе ў імперыі спакой і парадак, а таксама захоўвае ідэалагічную пераемнасць з мінулай дынастыяй Антанінаў.

Згодна з Герадыянам, Септымій Север правёў секулярныя гульні (ludi saeculares) у 204 г. н. э., падчас якіх адбыліся ўрачыстыя ахвярапрынашэнні і начныя містэрыі (Herodian III 8. 9) [2, с. 150]. Але Дыён Касій не прыгадвае гэтыя падзеі, толькі дае апісанне гульняў у гонар дзесяцігоддзя кіравання імператара Севера (Cass. Dio LXXVII 1. 1–5) [3, с. 262–263]. Падзеі 204 году не атрымалі асвятлення ў працы Дыёна Касія. Сучасныя даследчыкі Э. Скот і С. Данінг тлумачаць гэта тым, што рымскі гісторык спецыяльна разглядае падзеі 202 г. н. э., калі адзначалася дзесяцігоддзе кіравання імператара, і 204 г. н. э., як адно цэлае ў палітычнай прапагандзе Септымія Севера [8, p. 104–105; 15]. Дыён Касій такім чынам імкнуўся паказаць ілюзорнасць палітычных поспехаў і марнатраўства рымскага імператара [15].

Acta Severiana – эпіграфічны помнік, у якім апісваецца падрыхтоўка і правядзенне секулярных гульняў 204 г. н. э. дазваляе меркаваць аб важнасці дадзенага рэлігійнага і палітычнага мерапрыемства для Септымія Севера і яго сям'і [7, p. 287–338]. Згодна з Acta severiana імператар, яго жонка, Юлія Домна, і сыны, Каракала і Гета, прымалі ўдзел у арганізацыі і правядзенні секулярных гульняў [14, p. 41–63]. Па звестках Герадыяна, вяшчальнікі рымскага імператара запрашалі жыхароў Рыма і Італіі паўдзельнічаць ва ўрачыстасцях (Herodian III 8. 9) [2, с. 150]. Гэта дазваляе сцвярджаць, што секулярныя гульні Септымія Севера мелі агульнаімперскі характар. Хаця такая думка патрабуе пэўнага абгрунтавання эпіграфічным матэрыялам, які можа ўказаць на ўдзел жыхароў рымскіх правінцый ў гэтых гульнях. Разам з гэтым, аналіз эпіграфікі дазволіць выявіць рэакцыю насельніцтва на палітычную і рэлігійную прапаганду рымскага імператара. Бясспрэчна, што секулярныя гульні мусілі дэманстраваць палітычнае і рэлігійнае

адзінства імперыі пад кіраўніцтвам сям'і імператара. Гэтыя гульні мусілі пашырыць уплыў шанавання імператара і яго сям'і сярод жыхароў Рыма і рымскіх правінцый.

Урачыстасць секулярных гульняў адбывалася ў канцы траўня і пачатку чэрвеня, згодна з Acta Severiana [7, p. 287–338; 14, p. 63–89]. Першыя рытуалы праходзілі на Марсавым полі ў начы з 31 траўня на 1 чэрвеня, падчас якіх імператар, яго сыны, калегія квіндэцэмвіраў (quindecemviri sacris) і вясталкі прынялі ўдзел ва ўступнай малітве за дабрабыт Рыма (Acta Severiana 121–122) [7, p. 305]. Пасля гэта былі здзейснены ахвярапрынашэнні ў гонар грэчаскіх Мойр (Acta Severiana 138). Потым ішлі тэатральныя прадстаўленні і рытуальная трапеза 110 рымскіх матрон, якіх узначаліла Юлія Домна, у гонар Дыяны і Юноны (Acta Severiana 178–179) [7, p. 311]. Рытуалы ў першую ноч ўрачыстасці мусілі паспрыяць бяспецы Рыма і ўлагодзіць багоў. Правядзенне гэтых рытуалаў дэманстравала, што імператар і яго сям'я ўзначальваюць рымскую грамаду і імперыю перад аблiччам рымскіх багоў. Рытуалы першага дня ўрачыстасці былі прысвечаны вярхоўнаму богу Юпітэру Капіталійскаму, якому Септымій Север здзейсніў ахвярапрынашэнне (Acta Severiana 157–163) [7, p.309]. Галоўным боствам наступнага дня секулярных гульняў была багіня Юнона, якая ўваходзіла ў склад традыцыйнай капіталійскай трыяды. У гонар гэтай багіні былі здзейснены ахвярапрынашэнні, у якіх удзельнічаў імператар, яго сыны і калегія квіндэцэмвіраў (Acta Severiana 180–181) [7, p. 311]. Потым у Капіталійскім храме Юлія Домна і рымскія матроны з вясталкамі правялі ўрачыстую малітву багіне Юноне (Acta Severiana 184) [7, p. 313]. Начныя рытуалы і ахвярапрынашэнні трэцяга дня секулярных гульняў былі прысвечаны рымскай багіні зямлі – Тэлус [14, p. 112]. Удзень падчас трэцяга дня секулярных гульняў шанавалі Апалона і Дыяну (Acta Severiana 225, 231–233) [7, p. 321–323]. Завяршалі ўрачыстасць рытуальная песня і траянскі гульні [14, p. 140–165]. Acta Severiana сведчыць, што секулярныя гульні 204 г. н. э. былі прысвечаны шанаванню Лібера і Геракла, культ якіх у рымскай Афрыцы набліжаўся з культамі мясцовых пунічных боставаў [6, p. 146–155]. Септымій Север, згодна з Дыёнам Касіем, пабудаваў храм у гонар гэтых багоў у Лепціс-Магне, але рымскі гісторык ацэньвае дадзены крок, як чарговае марнатраўства імператара (Cass. Dio LXXVII 16. 3) [3, с. 277]. Зварот да культу Лібера і Геракла магло сведчыць, аб намеры рымскага імператара атрымаць прыхільнасць розных слаёў рымскага грамадства, якое шанавала гэтых багоў.

Спалучэнне рэлігійнага сінкрэтызму і рымскіх традыцый можна заўважыць у палітычнай прапагандзе Септымія Севера. На манетах гэтага імператара прысутнічаюць не толькі традыцыйныя рымскія багі, але сустракаюцца выявы егіпецкай Ісіды, Dea Caelestis, якая была рымскай адаптацыяй пунічнай багіні Таніт (RIC. IV. I. Septimius Severus. №. 25, 27a, 33–35, 49, 193, 272, 570, 577) [12, p. 319–366; 16]. Рымскія гісторыкі апісваюць сімпатыі Септымія Севера да багоў з усходніх правінцый імперыі. Г. Хальсберг выказвае думку, што падчас кіравання Септымія Севера ў Рыме была заснавана калегія жрацоў салярнага бога Эмесы, якая потым прыняла ўдзел у рэлігійнай рэформе імператара Элагабала [10, p. 77]. Эпіграфічны матэрыял пацвярджае гэтую думку, бо згадвае жраца гэтай калегіі Юлія Бальбіла (CIL VI, 1027; 2270) [9]. Верагодна, дадзеная калегія ўзнікла пад уплывам Юліі Домны і яе родзічаў, якія паходзілі з роду вярхоўных жрацоў сірыйскай Эмесы [11, p. 6–23]. У Рымскай гісторыі Дыёна Касія згадваецца паважлівае стаўленне Септымія Севера да культу апамейскага Баала або Бела, які меў значную папулярнасць сярод жыхароў рымскай Сірыі (Cass. Dio LXXIX 8. 5) [3, с. 312]. Зборнік біяграфій рымскіх імператараў сведчыць, што Север шанаваў егіпецкага бога Сераписа, калі наведваў Александрыю (SHA Sev., XVII 4) [1, с. 93].

Дыён Касій апісвае, што падчас наведвання Палестыны Север здзейсніў ахвярапрынашэнні духу Пампея, а ў Егіпце ўшанаваў Аляксандра Македонскага, грабніцу якога закрыў для наведвальнікаў (Cass. Dio LXXVI 13. 1–2) [3, c. 256]. Рымскі гісторык прыгадвае вялікую цікавасць Септымія Севера да кніг з нейкімі таемнымі ведамі, якія знаходзіліся ў егіпецкіх свяцілішчах, а таксама веру імператара ў астралагічныя прадказанні (Cass. Dio LXXVI 13. 2; LXXVII 11. 1) [3, c. 256, 272].

Рэлігійная палітыка Септымія Севера ў асвятленні рымскіх гісторыкаў з’яўляецца комплексам мер, якія былі накіраваны на ўмацаванне прэстыжу новай дынастыі пасля грамадзянскай вайны, на падкрэсліванне пераемнасці Севераў з дынастыяй Антанінаў. Дадзеная палітыка дэманстравала, што імператар і яго сям’я паважаюць традыцыі рымскай рэлігіі. Рымскія традыцыі мусілі кансалідаваць жыхароў імперыі пад уладай імператарскай сям’і. Сям’я імператара выступала пасрэднікамі паміж багамі і Рымам, праз рытуалы секулярных гульняў імкнулася гарантаваць бяспеку і спакой у Рымскай імперыі. Рымскія гісторыкі заўважалі прыхільнасць дынастыі Севераў да культу ўсходніх бостваў, але гэтая прыхільнасць не выклікае негатыўнай ацэнкі ў асяродку палітычнай і інтэлектуальнай эліты імперыі. Рымскія эліты негатыўна ставіліся да рэлігійнай рэформы Элагабала, які парушыў палітычную лінію першых прадстаўнікоў дынастыі Севераў у сферы рэлігіі. Галоўная асаблівасць рэлігійнай палітыкі Септымія Севера – гэта прагматычны баланс паміж рэлігійным традыцыяналізмам і сінкрэтызмам у імперыі. Такая палітыка мусіла кансалідаваць рымскае грамадства пасля грамадзянскай вайны, а таксама ўмацаваць уладу новай дынастыі. Рымскі імператар надаваў значную ўвагу культам традыцыйных рымскіх багоў і культам багоў з усходніх правінцый Рымскай імперыі, а таксама падтрымліваў культ абагаўленых імператараў. Заснавальнік дынастыі Севераў не мог ігнараваць пашырэнне рэлігійнага сінкрэтызму ў духоўнай культуры імперыі, але заўважаў кансерватыўныя настроі рымскай палітычнай эліты. Спалучэнне традыцыі і сінкрэтызму ў рэлігійнай палітыцы Септымія Севера дазваляла ўмацаваць уладу і ўзвысіць прэстыж новай дынастыі.

**Бібліяграфічныя спасылкі**


1. Властелины Рима: Биографии римских императоров от Адриана до Диоклетиана. СПб. : Алетейя, 2001.
2. *Геродиан* История императорской власти после Марка. СПб. : Алетейя, 1995.
3. *Кассий Дион* Римская история. Книги LXIV–LXXX. – СПб. : Филфак СПбГУ, 2011.
4. *Кюмон Ф.* Восточные религии в римском язычестве. СПб. : Евразиия, 2002.
5. *Штаерман Е. М.* Кризис рабовладельческого строя в западных провинциях Римской империи. М. : АН СССР, 1957.
6. *Birley A. R.* Septimius Severus. The African Emperor. L. : Routledge, 2002.
7. Die Inschriften zu den Ludi saeculares. Acta ludorum saecularium. – Berlin, Boston : De Gruyter, 2020.
8. *Dunnig S.* Roman Ludi saeculares from the Republic to Empire. Toronto : University of Toronto, 2016.
9. Epigraphik-Datebank [risorsa elettronico] – Modalità d’acceso: http://www.manfredclauss.de/gb/index.html – Data d’acceso: 01.11.2021
10. *Halsberge G. H.* The cult of Sol Invictus. Leiden : Brill, 1972.
11. *Levick B.* Julia Domna. Syrian Empress. N. Y. : Routledge, 2007.
12. *Lichtenberger A.* Severus Pius Augustus. Leiden, Boston : Brill, 2011.
13. *Momigliano A.* Manuale di storia romana. Torina : UTET, 2011.
14. *Rantala J.* The Ludi saeculares of Septimius Severus. The ideologies of a new Roman Empire. N. Y. : Routledge, 2017.
15. *Scott A. G.* Cassius Dio on Septimius Severus’ decennalia and Ludi saeculares // Histos. 2017. № 11. P. 154–161.
16. The Roman Imperial Coinage: in 10 v. L. : Spink&Son, 1936–1994. Vol IV. Part 1.